©БГУКИ

# АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ ЎМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ СЯМЕЙНЫХ АДНОСІН МОЛАДЗІ НА АСНОВЕ БЕЛАРУСКІХ ТРАДЫЦЫЙ

*А.С. СОЧНЕВА*, Л.І. КАЗЛОЎСКАЯ

In this paper we propose a special technique for the formation of family relations on the basis of Belarusian traditions. The methodology includes three components: organization and conduct of the Belarusian folk festivals, lectures, dialogues, registration of marriage Belarusian wedding traditions

Ключавыя словы: сям'я, моладзь, традыцыі, абрады

Гарманічнае функцыянаванне сям'і як значнага сацыяльнага і этнакультурнага інстытута знаходзіцца ў цэнтры ўвагі беларускага грамадства. І гэта не выпадкова, бо сям'я – асноўная крыніца ўзнаўлення нацыі, захавальнік багатых традыцый міжпакаленных адносін беларусаў, сістэмы роднасці і духоўнай блізкасці, транслятар нацыянальнай спадчыны і адвечных духоўных каштоўнасцей. Маральныя адносіны сям'і і яе матэрыяльнае становішча, мікраклімат у ёй, яе дабрабыт, духоўныя ідэалы адказваюць дзейсны ўплыў на сацыяльна-культурнае развіццё краіны, фарміруюць аснову стабільнасці ў будучым [1].

Сярод сучаснай моладзі вялікую ролю займаюць духоўныя і маральна-псіхалагічныя пачаткі. Але зараз існуе вялікая праблема разводаў: па статыстыцы, на 10 шлюбаў у цяперашні час прыходзіцца 5-6 разводаў. Гэта азначае, што кожная другая пара не вытрымоўвае «выпрабаванні шлюбам». Ужо зараз існуе патрэба зрабіць гэтыя паказчыкі лепей, дзеля гэтага можна выкарыстоўваць багатую старонку нашай культуры – беларускія традыцыі, абрады, народную педагогіку.

Каб далучыць моладзь да культурнай спадчыны, да нашых нацыянальных вытокаў, мы распрацавалі спецыялную методыку «Фарміраванне сямейных адносін у моладзі», на аснове беларускіх традыцый, сродкі якой поўнасцю адпавядаюць сучаснай дзяржаўнай праграмме «Культура Беларусі», якая патрэбна здзейсніцца за 2011-2015 гг.

Галоўнай асаблівасцю методыкі з'яўляецца арганізацыя і правядзенне свят, лекцыі-дыялогі, рэгістрацыя шлюбу па беларускім вясельным традыцыям. Першым і самым галоўным, на наш погляд, кампанентам з'яўляецца арганізацыя і правядзенне свят беларускага народнага каляндара. Наступны кампанент методыкі фарміравання сямейных адносін моладзі – лекцыі-дыялогі. Апошнім кампанентам методыкі стаў спецыяльна распрацаваны стылізаваны вясельны абрад.

Методыка па фарміраванню сямейных адносін моладзі выкарыстана на базе Сенненскага гісторыка-краязнаўчага музея, Сенненскага раённага Дома культуры, Сенненскага ЗАГСа і паказала добрыя вынікі. Усе тры кампаненты методыкі фарміравання сямейных адносін моладзі («Беларускі народны каляндар», лекцыі-дыялогі, спецыяльна арганізаваны «Вясельны абрад») паказалі добрыя вынікі. Калі параўноўваць першапачатковыя паказчыкі разводаў, то можна заўважыць, што замест 74 скасаваных шлюбаў на 100 пар цяпер гэта колькасць паменьшалася да 31 на 100 пар.

Такім чынам народныя традыцыі і звычаі выхавання – значная частка этнакультурнай спадчыны любых народаў. Захоўваць, вывучаць і перадаваць іх нашчадкам – умова жывучасці этнасаў і іх своеасаблівай самабытнай культуры. Асаблівасці народнай педагогікі: натуральнасць, непарыўнасць і імправізаванасць, пастаянства, вялікія творчыя магчымасці могуць быць сродкамі сыцыяльна-культурнай дзейнасці ў працэсе фарміравання сямейных адносін моладзі.

**Літаратура**

1. *Калачова, І.І.* Этнакультурныя працэсы ў гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI стст. / І.І. Калачова. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 266 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

©МУУ

# СВЯЗЬ НАРУШЕНИЯ ПИЩЕВОГО ПОВЕДЕНИЯ С ЛИЧНОСТНЫМИ КАЧЕСТВАМИ У МОДЕЛЕЙ

*И.А. ТАЛАНОВА*, Е.И. КОМКОВА

The work is devoted to research of specifics of eating behaviour and individual and psychological characteristics of girls working in the fashion business. Respondents were women involved modelling at the age of 18 to 26 years. The study was determined a statistically significant relationship between personality traits of female models, indicators of professional motivation and the presence of their predisposition to the development of eating disorders

Ключевые слова: нарушения пищевого поведения, моделинг, профессиональная мотивация, личностные черты

Объективная реальность в сфере модельного бизнеса напрямую связывает успешность карьеры с категорическим соблюдением установленного стандарта внешности девушек, что лишь способствует увеличению тревожности, эмоциональной нестабильности, собственной неэффективности и неудовлетворенности своим телом, являющимся, по факту, инструментом трудовой деятельности. В свою очередь, связь стройности и женственности в значительной мере преувеличена еще и усилиями